# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ, З ДНЁМ ВЕДАЎ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 11 (931) | ПАНЯДЗЕЛАК, 1 верасня 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## З УЗНАГАРОДАЙ, ЮБІЛЯРЫ!

За шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць, вялікі асабісты ўклад у развіццё вышэйшай школы і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння першы прарэктар нашага універсітэта, прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар **СЕЛЬКІН Міхаіл Васільевіч** узнагароджаны Ганаровай граматай Гомельскага аблвыканкома.

У сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту, дацэнт, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, член Нацыянальнага Алімпійскага Камітэта краіны **КАЛЯДА Віктар Антонавіч** за шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўзнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі, увесь калектыў універсітэта горача віншуюць юбіляраў са знамянальнымі датамі ў іх жыцці, высокай ацэнкай іх працоўнай і грамадскай дзейнасці і жадаюць ім далейшых поспехаў на гэтай ніве, моцнага здароўя і асабістага дабрабыту.***

Слова да першакурснікаў

## МЫ КЛАПОЦІМСЯ АБ ВАС

Якімі будуць для вас, дарагія першакурснікі, пяць студэнцкіх гадоў? Гэта пытанне сёння цікавіць вас найбольш асабліва, бо наперадзе шмат нязведанага, неспазнанага.

Гады вучобы -- не толькі адны заняткі і сесіі. Гэта яшчэ і цікавае жыццё. І менавіта такім яно будзе, дзякуючы і вам самім, і грамадскім арганізацыям універсітэта. Адна з іх -- студэнцкі прафсаюз. Калі вы ўступіце ў прафсаюз, то будзеце з"яўляцца членамі арганізацыі, якая ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі заканадаўчымі актамі, будзе адстойваць і абараняць вашы сацыяльна-эканамічныя правы і інтарэсы, якія вызначаны ў калектыўным дагаворы, заключаным паміж рэктаратам ГДУ і прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў.

Прафсаюзы гарантуюць вам сацыяльную абарону -- аказанне матэрыяльнай дапамогі, арганізацыю цікавага і змястоўнага адпачынку, забеспячэнне пуцёўкамі для лячэння і аздараўлення ва універсітэцкі санаторый-прафілакторый. У ім ёсць неабходная лячэбная база -- шматпрофільныя кабінеты з сучаснай апаратурай, абсталяваннем. Студэнты забяспечваюцца тут трохразовым каларыйным харчаваннем.

Зрабіце свой выбар!

**Н.КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў ГДУ.**

## АТРЫМАЛІ ДАПАМОГУ

У апошні час для нас ужо стала заканамернай з'явай атрыманне гуманітарнай дапамогі з-за мяжы. Людзі з заходніх краін імкнуцца, чым могуць, падзяліцца з беларускім народам, якому лёс наканаваў чарнобыльскае выпрабаванне. Да таго ж, свае адмоўныя моманты ўносіць у наша жыццё эканамічная нестабільнасць, з-за якой жыццё многіх людзей у матэрыяльным плане значна ўскладнілася.

Абласное грамадскае аб'яднанне "Садружнасць", якое дзейнічае ў Гомелі не першы год, наладзіла цесныя сяброўскія і дзелавыя кантакты з нямецкім горадам Гундэльфінген акругі Дзілінген, жыхары якога з адкрытым сэрцам дапамагаюць нашаму абласному цэнтру. Неаднаразова яны дастаўлялі ў Гомель гуманітарныя грузы для дзіцячых дамоў, школаў-інтэрнатаў, бальніц і г.д. Вялікую работу па збору грашовых сродкаў, медыкаментаў, адзення, абутку праводзяць у сябе на радзіме ўдзельнікі харавой капэлы вышэйназванага горада, якой кіруе Герман Бесвальд. Грошы, сабраныя імі ў час сваіх канцэртаў, розныя рэчы для дзяцей і дарослых яны прывозяць з сабой да нас у Гомель і раздаюць тым, каму яны больш за ўсё неабходны.Дзякуючы члену прафкома ГДУ А.Л.Вайцішкінай партыя гуманітарнага грузу ад іх была выдзелена ў жніўні і нашаму універсітэту. Створаная на базе прафкома супрацоўнікаў камісія размеркавала яе сярод работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, як найбольш маламаёмных. Былі складзены спісы шматдзетных сем'яў, якія атрымалі адзенне, абутак, дзіцячыя цацкі. Дапамогу атрымала звыш 40 сем'яў.

Сярод дастаўленых рэчаў ёсць неабходныя прадметы па догляду за маленькімі дзецьмі, якія мяркуецца аддаць тым работніцам універсітэта, якія сталі маці.

Універсітэцкі санаторый-прафілакторый змог таксама крыху папоўніць свае медыкаментозныя запасы.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## ВІНШУЕМ!

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры агульнай фізікі дацэнта СЕМЧАНКУ Ігара Валянцінавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.***

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства БАГАЕДАВУ Таццяну Мікалаеўну (навуковы кіраўнік -- прафесар названай кафедры Р.М.Казлова) з паспяховай абаронай на спецыялізаваным Савеце пры ГДУ дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.***

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць ст. выкладчыка кафедры беларускай мовы БАГАМОЛЬНІКАВУ Наталлю Аляксееўну з зацвярджэннем яе БелВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.***

*Да вынікаў уступных экзаменаў-97*

# ЗА ПРАВА СТУДЭНТАМІ ЗВАЦЦА

Мінуў месяц пасля заканчэння ўступных экзаменаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Як паведамлялася ў рэспубліканскім друку, у ВНУ Беларусі на дзённыя аддзяленні паступала сёлета звыш 50 тысяч абітурыентаў на планавыя 23,5 тысячы месцаў, у тым ліку каля 9 тысяч медалістаў сярэдніх школ, каля 3 тысяч уладальнікаў дыпломаў ССНУ з адзнакай, 300 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд.

У пачатку жніўня адбылося залічэнне ў студэнты. Першакурснікамі сталі тыя, хто найбольш паспяхова вытрымаў конкурсныя выпрабаванні. А для каго яны аказаліся не пад сілу і няма сродкаў набываць вышэйшую адукацыю на платнай аснове, давядзецца працягваць падрыхтоўку для паступлення на вучобу ў наступным годзе.

**А** цяпер, што тычыцца нашага універсітэта. Кантроль за работай прыёмнай камісіі і ўступных экзаменаў ажыццяўляўся на падставе Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь N385 ад 11 ліпеня 1997 г. Адміністрацыяй Прэзідэнта для кантралюючых функцый у наш універсітэт быў накіраваны намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь В.В.Бушчык. Ён працаваў у цесным кантакце з галоўным спецыялістам Камітэта дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці М.Н.Гром.

У працэсе падрыхтоўкі да кантролю за ходам уступных экзаменаў у ГДУ загадам упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкома ад 5 ліпеня 1997 г. была створана грамадская камісія з 21 незалежнага педагога па кантролю за арганізацыяй і правядзеннем уступных экзаменаў у нашым універсітэце.



*Запісваюцца тэмы сачыненняў.*



*Асада "цытадэлі ведаў". Перад першым экзаменам.*

## АБІТУРЫЕНТАЎ УБАВІЛАСЯ

Сёлета на першы курс дзённага аддзялення ГДУ ажыццяўляўся прыём па 27 спецыяльнасцях, у тым ліку па такіх, як фізічная электроніка, фінансы і крэдыт, камерцыйная дзейнасць, псіхалогія -- упершыню. Па дзяржаўнаму плану на першы курс патрэбна было набраць 975 чалавек -- на 75 больш, чым у мінулым годзе. Абітурыентамі нашага універсітэта сталі 1635 юнакоў і дзяўчат -- на 183 менш леташняга. На кожнае вучэбнае месца прэтэндавала ў сярэднім 1,67 чалавека. Бадай, гэта быў самы нізкі конкурс за ўсе гады існавання ГДУ. Для параўнання скажам, што ў 1995 і 1996 гадах конкурс складаў адпаведна 1,89 і 1,96 чалавека на месца.

Аднак змяншэнне абітурыентаў не азначае, што падае прэстыж нашага універсітэта. Па-першае, за апошнія гады значна павялічылася колькасць ВНУ, і асабліва недзяржаўных. Па-другое, беларусы цяпер маюць права на роўных правах паступаць у расійскія навучальныя ўстановы. І яшчэ адна акалічнасць. Сёлета медалісты школ і выпускнікі ССНУ, якія атрымалі дыпломы з адзнакай, пры паступленні ў ГДУ здавалі ўсе экзамены. У іншых жа ВНУ яны мелі ранейшыя льготы. Гэтым і тлумачыцца той факт, што ў гэтым годзе ў нас прыкметна зменшыўся кантынгент такіх абітурыентаў.

У прыёмную камісію універсітэта ўваходзілі 22 чалавекі -- рэктар і прарэктары, дэканы факультэтаў, начальнік абласнога ўпраўлення адукацыі, тры прадстаўнікі прафсаюза, член Беларускага патрыятычнага саюза моладзі.

У 9 прадметных экзаменацыйных камісій разам з выкладчыкамі універсітэта было ўключана 16 настаўнікаў сярэдніх школ г.Гомеля.

Уступныя экзамены засведчылі, што веды сёлетніх абітурыентаў аказаліся больш трывалымі, чым у папярэднія гады. На гэты раз з іспытамі справілася 76% паступаючых у ГДУ, а летась, для параўнання, -- 68%.

## ТАКІМ БЫЎ КОНКУРС

Убавілася абітурыентаў і, як вынік гэтага, панізіўся конкурс. Па факультэтах і асобных спецыяльнасцях ён аказаўся наступным (у дужках прыводзяцца леташнія паказчыкі). Сёлета самы высокі быў конкурс на факультэце фізічнай культуры і спорту -- 2,6 чалавека на месца (2,8). Адносна стабільна выглядаў і гісторыка-юрыдычны факультэт. Вось конкурс на яго спецыяльнасці: правазнаўства -- 2,4 (2,3), гісторыя і англійская мова -- 2,4 (2,0), гісторыя -- 1,8 (2,8), гісторыя і нямецкая мова -- 1,15 (4,5).

На філалагічным факультэце на кожнае вучэбнае месца прэтэндавала: на беларускую мову і літаратуру -- 2,1 (2,8), рускую мову і літаратуру -- 1,85 (2,5), рускую мову і літаратуру і беларускую мову і літаратуру -- 1,8 (2,4), беларускую мову і англійскую мову -- 1,7 (2,4), нямецкую мову -- 1,55(2,1), англійскую мову -- 1,5(1,8).

Больш роўным быў конкурс на спецыяльнасці эканамічнага факультэта: бухулік, аналіз і аўдыт -- 1,9 (2), фінансы і крэдыт -- 1,9, эканоміка і кіраванне на вытворчасці -- 1,6(1,9), камерцыйная дзейнасць -- 1,5.

На біялагічным факультэце за кожнае месца, як і летась, змагалася па 1,5 чалавека.

Невысокая канкурэнтная барацьба была на геолага-геаграфічным факультэце. На яго спецыяльнасці



конкурс аказаўся такім: геалогія і разведка карысных выкапняў -- 1,3 (1,5), геаграфія -- 1,3(1,7), геаграфія і англійская мова --1,4(1,4), геаграфія і нямецкая мова -- 1,15.

На матэматычным факультэце на вылічальную матэматыку конкурс складаў 1,3(1,8), на педагагічны паток -- 1,2(1,6).

У апошнія гады не перастае здзіўляць фізічны факультэт, дзе, па сутнасці, не існуе ніякага конкурсу. Вось і сёлета на 25 планавых месц педагагічнага патоку заявы падало столькі ж абітурыентаў. І ўсе яны сталі першакурснікамі. Усяго адзін лішні канкурэнт быў на вытворчы паток і два на спецыяльнасць фізіка і тэхнічная творчасць. На спецыяльнасць аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі конкурс склаў 1,35. На пералічаныя спецыяльнасці летась конкурс быў адпаведна -- 1,2; 1,2; 1,3; 1,5. На фізічным факультэце не стала прыцягальнай нават новая перспектыўная спецыяльнасць -- фізічная электроніка. Уступныя экзамены на 25 планавых месц здавала ўсяго 32 абітурыенты.



*Ёсць над чым падумаць.*

На новую спецыяльнасць -- псіхалогія сёлета паступала 45 абітурыентаў, 1,8 чалавека на месца.



*Як хочацца нічога не забыць.*

## АБ ПРАХАДНЫХ БАЛАХ

Хаця сёлета конкурсныя паказчыкі аказаліся прыкметна ніжэйшымі за леташнія, а вось прахадныя балы наадварот узраслі. Дастаткова сказаць, што яны павысіліся на 9 спецыяльнасцях і толькі на адной знізіліся, а па астатніх аказаліся аднязначнымі. Што тычыцца правазнаўства, то на гэтую спецыяльнасць здавалі 4 уступныя экзамены і каб стаць студэнтам, патрэбна было набраць 18 балаў. Усе астатнія абітурыенты здавалі па 3 экзамены. Каб стаць першакурснікам без усякіх ільгот, трэба было набраць па 15 балаў на спецыяльнасці гісторыя і англійская мова, англійская мова (летась адпаведна 14,13). Пропускам у лік студэнтаў сталі 14 балаў на гісторыю (13), нямецкую мову (13), беларускую мову і літаратуру і англійскую мову (14), беларускую мову і літаратуру (14).

13 балаў хапіла для таго, каб набываць веды па гісторыі і нямецкай мове (13), геаграфіі і англійскай мове (12), эканоміцы і кіраванню на вытворчасці (13), рускай мове і літаратуры і беларускай мове і літаратуры (12), рускай мове і літаратуры (12), на факультэце фізічнай культуры і спорту (12), на біялагічным факультэце (9).

12 балаў сталі прахаднымі на вылічальную матэматыку (13), бухулік, аналіз і аўдыт, геаграфію і нямецкую мову (12), геаграфію (12).

11 набраных балаў забяспечылі поспех тым, хто паступаў на педпаток матэматычнага факультэта (11), педпаток фізічнага факультэта (9), на аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі (11), фізіку і тэхнічную вытворчасць (10).

Круглым троечнікам спадарожнічала ўдача, якія паступалі на вытворчы паток фізічнага факультэта, геалогію і разведку карысных выкапняў.

На новыя спецыяльнасці прахадны бал склаўся такім: псіхалогія -- 13, фінансы і крэдыт, камерцыйная дзейнасць -- 12, фізічная электроніка -- 9.

## НЕ АДНОЛЬКАВАЙ ВАРТАСЦІ

Сёлета, бадай, упершыню на ўсе факультэты і спецыяльнасці ў большай або меншай меры паступалі медалісты агульнаадукацыйных школ. З гэтымі ўзнагародамі было 315 абітурыентаў, 257 з іх здолелі пацвердзіць свае грунтоўныя глыбокія веды і стаць першакурснікамі. Астатнія строгае выпрабаванне не вытрымалі і, як кажуць, засталіся за бартом. Пры гэтым 33 медалісты атрымалі двойкі.

Найбольшая колькасць медалістаў -- 55 -- паступала на правазнаўства. Але і найбольшая колькасць іх тут адсеялася -- 25. З высокім узроўнем ведаў паступалі медалісты на матэматычны факультэт, англійскую мову. Самыя высокія працэнты паступіўшых на спецыяльнасці: фінансы і крэдыт -- 60%, прыкладная матэматыка -- 52, англійская мова, камерцыйная дзейнасць -- па 48, эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве і правазнаўства -- па 40, беларуская мова і літаратура і англійская мова -- 36, педагагічная матэматыка -- 34,5%. Сярод абітурыентаў, якія скончылі ССНУ і ПТВ з дыпломам з адзнакай, быў 21 чалавек. З гэтай катэгорыі першакурснікамі сталі 10 чалавек.

## АДЗНАЧАНА Ў СПРАВАЗДАЧЫ

У справаздачы старшыні дзяржаўнай камісіі для ажыццяўлення кантролю за работай прыёмных камісій і правядзеннем уступных экзаменаў В.П.Замяталіну член яе рабочай групы В.В.Бушчык паведамляў наступнае. У першы дзень уступных экзаменаў 17 ліпеня 1997 г. усе абітурыенты мелі магчымасць паглядзець па тэлебачанні зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да моладзі і аб'яву тэм сачыненняў па рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры.

Пасля праверкі сачыненняў і пісьмовых работ па матэматыцы адпаведнымі прадметнымі камісіямі была ажыццёўлена выбарачная пераправерка дадзеных работ спецыялістамі па гэтых прадметах з ліку членаў грамадскай камісіі. Толькі ў трох выпадках былі зменены адзнакі па сачыненнях.

Якіх-небудзь парушэнняў парадку правілаў пры-

(ЗАКАНЧЭННЕ на 4-й стар.)

# І ЛАЎРЭАТЫ, І ПРЫЗЁРЫ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 5-й стар.)

цыйную работу праводзіў абласны цэнтр народнай творчасці ў складзе намесніка дырэктара АЦНТ Э.А.Хлыстуновай і вядучага спецыяліста па тэатральнаму жанру А.У.П"янковай.

У першы дзень мы былі сведкамі закладкі помніка аўцюкоўскім персанажам Каласку і Калінцы. Затым з песнямі і скокамі, жартамі і розыгрышамі прайшлі па вуліцах Вялікіх Аўцюкоў. Прычым, кожнае падвор"е сустракала гасцей рознымі стравамі і пітвом. Парканы былі ўпрыгожаны саматканымі ручнікамі, посцілкамі і дыванамі, а побач стаялі самаробныя драўляныя вырабы. Ад такой прыгажосці вочы разбягаліся. Лішні раз мы пераканаліся, што наш народ сапраўды таленавіты, што ён не толькі добра працуе, але і з густам адпачывае. Першы дзень фестывалю скончыўся вялікім канцэртам, якому не перашкодзіў нават дождж.

На другі дзень на міжлессі паміж Вялікімі і Малымі Аўцюкамі адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю, пасля чаго ўдзельнікі пачалі спаборніцтвы ў розных намінацыях. Каля пляцовак, дзе праходзіў паказ конкурсных праграм, народу збіралася столькі, што яблыку не было дзе ўпасці. Кожнае выступленне глядач успрымаў выбухам смеху. Казалі, што лес гудзеў ад яго. Артысты тэатра-студыі Святлана Карчэўская і Дзмітрый Жыхараў выступалі ў конкурсе інсцэніраванай байкі. На суд журы і гледача была прадстаўлена байка Ул.Правасуда "Вузел". Апладысменты і ўсмешкі былі лепшай узнагародай студыйцам.

А ў гэты час на іншых пляцоўках змагаліся анекдотчыкі і прыпевачнікі. Добры настрой гледачоў і ўдзельнікаў перадаўся надвор"ю. Сонейка свяціла ўвесь час, пакуль дэлегацыі не раз"ехаліся па гаспадарках раёна. У в.Варатынь наша дэлегацыя паказала такі канцэрт, што старшыня калгаса быў вымушаны даць святочную вячэру для яго ўдзельнікаў. Стомленыя, але задаволеныя, мы прыехалі на базу.

На наступны дзень зноў "у бой". На гэты раз гледача чакалі конкурсы беларускай гульні, байкі і праграмы тэатраў-мініяцюр. Тэатр-студыя "Если бы..." паказаў спектакль "Аўцюкоўцы" па матывах аўцюкоўскіх анекдотаў. Хваляваліся не толькі ўдзельнікі, але і журы. Глядач так ветліва ўспрымаў выступленне, што хваляванне прайшло адразу. Вялікі табе дзякуй, глядач!

З нецярпеннем чакалі ўсе вынікаў фестывалю: "Хто, хто пераможа?" Але прадстаўнік Міністэрства культуры рэспублікі Т.І.Стружэцкі абвясціў, што ўсе ўдзельнікі будуць узнагароджаны пацалункам самога Уладзіміра Ліпскага, ініцыятара гэтага свята. Жанчыны пачалі наводзіць макіяж, а мужчыны прычоскі. Дарэчы, Ул.Ліпскі свой абяцанак выканаў. І вось сярод многіх калектываў і ўдзельнікаў прагучала назва нашага тэатра. Акрамя звання лаўрэата і другога месца ў намінацыі "Інсцэніраваная байка" студыйцы прывезлі прыз газеты "Рэспубліка". Патрачаны час, перажыванні, карпатлівая праца не прайшлі дарэмна. І заслуга ў гэтым удзельнікаў калектыву: Андрэя Пацкова, Наталлі Серыкавай, Наталлі Кулагінай, Алега Шабаліна, Святланы Карчэўскай, Валянціны Варонінай, Дзмітрыя Жыхарава, Ганны Гуляевай. Будзем спадзявацца, што гэта ўзнагарода прыдасць новы імпульс у творчай працы не толькі гэтым рабятам, але і тым, хто не змог паехаць на гэты фестываль, і хто да нас у калектыў прыйдзе.

Дзякуй табе, фестываль, за радасць і надзею, падораную людзям, за новых сяброў, за падоўжанае жыццё!

**Г.ВАРОНІН, рэжысёр культурнага цэнтра ГДУ, кіраўнік студэнцкага тэатра-студыі "Если бы..."**

*Зберагчы і захаваць*

# ...АДВЕЧНАЙ ПЕСНІ МАТЫЎ

"Нічога вы ўжо не зробіце, не зможаце змяніць наш час, не вернеце мілую старынушку. Вось каб раней гадоў на дзесяць-пятнаццаць вы прыехалі, тады б мы вам парасказалі: і пра абрады, пра звычаі, як жылі, рабілі, весяліліся ў святы і плакалі ў горы. А зараз -- складана, вельмі цяжка, мазгі павысыхалі, паўміралі самыя старыя, так і не распавёўшы пра тое, што ведалі. Вось каб раней... Ды толькі пустата ўсё, дзетачкі... Ды і ці трэба вам гэта?...", — казала старэнькая бабулька ў пацёртым кажушку, седзячы на драўлянай лаўцы перад хатай у адной з вёсак Кармянскага раёна, назвы якой я, на жаль, дакладна не памятаю. І не так гэта і важна, бо ў кожнай вёсцы мы, студэнты-першакурснікі, што прыехалі сюды на фальклорную практыку, чулі прыкладна тыя ж самыя словы. І неяк крыўдна і горка станавілася на душы: здавалася, гэты балючы папрок адносіўся да кожнага з нас асабіста, і ўсе мы быццам бы адчулі сябе ў нечым вінаватымі... Ды толькі ў чым?..

Сёлета, у працяг былой традыцыі, для студэнтаў першага курса, якія здалі свае апошнія экзамены, была арганізавана фальклорная экспедыцыя ў Кармянскі раён Гомельскай вобласці. Галоўным ініцыятарам і кіраўніком гэтай паездкі стала Валянціна Станіславаўна Новак, дацэнт кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта нашага ўніверсітэта. Менавіта дзякуючы, перш за ўсё, яе намаганням, сёння можна гаварыць аб тым, што наша практыка ўдалася. Падчас гэтай экспедыцыі студэнты наведалі некалькі дзесяткаў вёсак Кармянскага раёна, быў сабраны вялікі фальклорны матэрыял, з якога будзе складзены спецыяльны зборнік. А кожны з нас меў рэальную магчымасць не толькі замацаваць тэарэтычныя веды, атрыманыя пры вывучэнні курса народнай вусна-паэтычнай творчасці, але і на практыцы пачуць мілагучныя песні, добрыя чароўныя казкі, загадкі, цікавыя аповеды пра адзначэнне розных знамянальных дат у жыцці беларускага селяніна. Усё гэта дало нам шанц зазірнуць у таямніцу народнай душы, яшчэ раз адчуць нацыянальную самабытнасць беларусаў. Увесь час знаходжання нашай групы ў Кармянскім раёне мы быццам бы чулі адну, незвычайна прыгожую, але чамусьці сумную Адвечную песню...

І сапраўды, гэтая паездка навучыла нас вельмі многаму. За гэты час мы зразумелі, што знайсці падыход да кожнага чалавека, умець зацікавіць сваім расказам — гэта таксама вялікае мастацтва, якім абавязкова павінен валодаць будучы настаўнік. Трэба адзначыць, што вельмі вялікую дапамогу ў арганізацыі штодзённай працы нам аказалі работнікі Кармянскага цэнтра культуры, якія рабілі ўсё магчымае, каб забяспечыць групу ўсім неабходным. Стараліся яны ўсе ад душы, бо іх з'яднала з намі агульная мэта: сабраць па кавалачках і зберагчы тое, што яшчэ можна выратаваць, перадаць нашчадкам. Усё гэта прымусіла шмат над чым задумацца, многае пераасэнсаваць...

І, напэўна, яшчэ вельмі доўга будзем мы ўспамінаць невялічкую хатку, драўляную лаўку і сівенькую бабульку ў пацёртым кажушку, што гаварыла : "Не трэба вам гэтага, дзеткі. Не аднавіць ужо разбуранага..." І хацелася штосьці запярэчыць гэтай старой, сказаць, што мы абавязкова зможам, здолеем, захаваем для наступных пакаленняў Адвечную песню беларусаў...

**Святлана КАГАН, студэнтка гр. БА-23 філалагічнага факультэта.**



*Да ўвагі студэнтаў*

# ІНТЭРНАТ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ -- ІЛЬГОТНІКАМ

На сённяшні дзень у інтэрнатах універсітэта ёсць 157 свабодных месц. У першую чаргу яны будуць выдзяляцца студэнтам, якія маюць пэўныя льготы. Да такой катэгорыі адносяцца: дзеці-сіраты, студэнты, якія не маюць аднаго з бацькоў, а таксама са шматдзетных сем'яў (трое або больш дзяцей), студэнты старэйшых курсаў, якія раней жылі на прыватных кватэрах.

Для студэнтаў, якія сёлета таксама будуць жыць на прыватных кватэрах, дзяржавай прадугледжана выплата грашовай кампенсацыі ў памеры 25% мінімальнай зарплаты.

Аплата за пражыванне ў інтэрнатах універсітэта складае: інтэрнаты N1 і N2 -- 23%, N4 -- 24% ад мінімальнай зарплаты.

Усе дакументы, неабходныя для атрымання месца ў інтэрнатах ГДУ, неабходна падаваць у аддзел выхаваўчай работы (галоўны корпус, п.1-16). Даведкі па тэл. 56-57-73.

**В.ГАПЕЕЎ, загадчык аддзела выхаваўчай работы.**

жжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжжж

*Агляд спартыўных дасягненняў*

# РАЗБЕГ У 2000 ГОД

**У**се спаборніцтвы ў 1996-1997 навучальным годзе праходзілі скрозь прызму Алімпійскіх гульняў 2000 года ў Сеуле.

І пачатак у студэнтаў нашага ўніверсітэта быў упэўненым. Выпускнік факультэта фізічнай культуры Сяргей Дземчанка на першынстве свету сярод студэнтаў заняў трэцяе месца па вольнай барацьбе. Праз тыдзень, падтрымаўшы пачын Сяргея, студэнт гэтага факультэта трэцякурснік Вячаслаў Макаранка на такіх жа спаборніцтвах па грэка-рымскай барацьбе заваяваў залаты медаль. У канцы снежня мінулага года праходзілі аналагічныя спаборніцтвы па гандболу. У саставе зборнай Рэспублікі Беларусь выступалі Павел Старасвецкі і Валерый Цімашэнка.

1997 год таксама пачаўся паспяхова. Першыя весткі прыйшлі да нас з Віцебска. Браты Багданавы, выступаючы на турніры па грэка-рымскай барацьбе імя Даватара, упершыню выканалі нарматыў майстра спорту РБ.

У студзені праходзіў чэмпіянат Беларусі па акрабатыцы, дзе паспяхова выступіў Канстанцін Гоманаў. Ён упершыню выканаў нарматыў майстра спорту Рэспублікі Беларусь, а Андрэй Мус двойчы быў трэцім.

На зімовым чэмпіянаце рэспублікі па лёгкай атлетыцы на прызы газеты "Спортивная панорама" вельмі паспяхова выступілі нашы студэнты. Для Аляксандра Слюнькова, Наталлі Сазановіч гэта былі першыя старты, якія засведчылі, у якой форме яны адкрываюць новы цыкл -- у гэтым годзе праходзіў чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы. Яны павінны былі паказаць высокія вынікі ўжо ў пачатку сезона, каб стаць членамі нацыянальнай каманды. А найбольш паспяхова выступілі Аляксандр Цітоў у бегу на 400 і 1000 м, у трайным скачку Наталля Касцючэнка, у бегу на 1500 м -- Сяргей Цішкоў, бегу на 60 м з бар'ерамі -- Уладзімір Касцючык і Юлія Паспелава.

У Мінску праходзіў Кубак Рэспублікі Беларусь па вольнай барацьбе. Асноўны касцяк каманды вобласці склалі студэнты факультэта фізічнай культуры і спорту. Яны выйгралі Кубак РБ. Першыя месцы ў сваіх вагавых катэгорыях занялі Дзмітрый Захарчанка, Мікалай Краснапееў, Сяргей Дземчанка, Сяргей Драбкоў, бронзавымі прызёрамі сталі Дзмітрый Ляцецкі, Аляксандр Гузаў, Аляксей Дземчанка.

23 лютага ў Гомелі праходзіў Кубак РБ па лёгкай атлетыцы сумесна з ВНУ рэспублікі. Каралева спорту першай адкрывала дарогу студэнцкай спартакіядзе. Зборная каманда нашага ўніверсітэта заняла другое агульнакаманднае месца, прайграўшы Акадэміі фізічнага выхавання і спорту. За лёгкаатлетамі выступалі дзюдаісты. Каманда ГДУ таксама аказалася сярод прызёраў -- трэцяе месца.

У сакавіку праходзілі спаборніцтвы па плаванню. У праграме спартакіяды зборная каманда нашага ўніверсітэта заняла другое месца. У канцы мая на летнім чэмпіянаце ВНУ РБ па лёгкай атлетыцы ў г.Мінску зноў, як і зімой, зборная каманда ўніверсітэта заняла другое агульнакаманднае месца. Першыя месцы занялі: у бегу на 100 і 200 м Наталля Салагуб, Аляксандр Слюнькоў, Валянціна Баравая ў кіданні кап"я, Таццяна Гулевіч у скачках у вышыню, Наталля Сазановіч у бегу на 100 м з бар'ерамі і скачках у даўжыню, Яўген Пудакоў у кіданні дыска. Другія месцы занялі Людміла Старавойтава ў кіданні дыска і штурханні ядра, Сяргей Цішкоў у бегу на 1500 і 3000 м, Уладзімір Касцючэнка ў бегу на 110 м з бар'ерамі, Аляксандр Цітоў -- першае ў бегу на 800 м і другое ў бегу на 400 м. За лёгкаатлетамі ў барацьбу ўступіла каманда нашага ўніверсітэта па паўэрліфтынгу, якая заняла першае агульнакаманднае месца. Гэта, несумненна, яе поспех і трэнера ст.выкладчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту Уладзіміра Аляксандравіча Галавача.

На Кубку Еўропы па лёгкай атлетыцы сярод клубных каманд, які праходзіў у Турцыі ў маі, у саставе зборнай нашай рэспублікі выступаў Аляксандр Цітоў у эстафеце 4х400 м. На гэтых спаборніцтвах наша каманда заняла першае месца.

Паспяхова выступілі на спартакіядзе сярод ВНУ рэспублікі і нашы весляры. Яны не пакінулі ніякіх шансаў камандзе АФВ і С і ўпэўнена занялі першае агульнакаманднае месца. У гэтым вялікая заслуга ст.выкладчыка кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту заслужанага трэнера РБ Уладзіміра Кузьміча Паўлючкова. Спартакіяда закончылася веславаннем і, як бачна, зборная каманда нашага ўніверсітэта выглядае ў ёй дастойна. З кастрычніка па снежань у барацьбу ўступяць гандбалісты (мужчыны і жанчыны), баскетбалісты (чэмпіёны мінулага года), футбалісты, валейбалісты, асілкі грэка-рымскай і вольнай барацьбы.

На Кубку рэспублікі па веславанні на байдарках і каноэ прызёрамі сталі: Сяргей Вераксіч, Андрэй Каваленка, Аляксандр Яфімовіч, Сяргей Лаўнікрвіч, Ганна Арэшка.

На маладзёжным чэмпіянаце Еўропы па вольнай барацьбе Дзмітрый Захарчанка заваяваў бронзавы медаль.

10-13 ліпеня ў Фінляндыі адбыўся чэмпіянат Еўропы сярод моладзі. У саставе зборнай каманды РБ на ім выступалі і нашы студэнты. У трайным скачку Наталля Касцючэнка заняла 8-е месца, Наталля Салагуб у бегу на 200 м таксама была восьмай, а Аляксандру Слюнькову не хапіла адной сотай секунды, каб выступіць у фінальным забегу на 200 м. Затое на Кубку Еўропы па лёгкай атлетыцы Аляксандр Слюнькоў заваяваў залаты медаль усё ў тым жа бегу на 200 м з вынікам 21.03.

У маі адбыўся Кубак рэспублікі па футболу. За каманду "Белшына" (Бабруйск) выступалі браты Ігар і Эдуард Градабоевы. Яны сталі ўладальнікамі Кубка РБ па футболу 1997 г. і ўпершыню выканалі нарматыў майстра спорту. У канцы чэрвеня разыграны Кубак РБ па шматбор"ю "Здароўе". Вельмі паспяхова выступілі нашы студэнты факультэта фізічнай культуры і спорту Наталля Соцкая, Аляксей Кашаедаў, Аляксандр Іваноўскі. Яны занялі першае месца, а Аляксей і Аляксандр упершыню выканалі нарматыў майстра спорту РБ.

На працягу ліпеня праходзілі II Балканскія гульні па грэка-рымскай барацьбе. Залаты медаль заваяваў МСМК Вячаслаў Макаранка.

У жніўні ў Грэцыі праходзіў чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы. У саставе зборнай Рэспублікі Беларусь выступала і наша студэнтка сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у г.Антанце Наталля Сазановіч. На жаль, у прызёры яна не трапіла.

**У.ЛЕМЯШКОЎ, дырэктар спартыўнага клуба, кандыдат педагагічных навук.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

## аб'яўляе прыём у аспірантуру ў 1997 годзе

*па спецыяльнасцях*
*з адрывам ад вытворчасці:*

дыферэнцыяльныя ўраўненні; матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў; тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка; механіка цвёрдага дэфармуемага цела; тэарэтычная фізіка; радыёфізіка; оптыка; фізіка цвёрдага цела; радыебіялогія; батаніка; фізіялогія чалавека і жывёлы; экалогія; гідрагеалогія; фізіка цвёрдай зямлі; вылічальныя машыны, комплексы сістэмы і сеткі; прымяненні вылічальнай тэхнікі, матэматычнага мадэліравання і матэматычных метадаў у навуковых даследаваннях; палітычная эканомія; эканоміка і ўпраўленне народнай гаспадаркай; літаратура народаў Расіі (беларуская літаратура); беларуская мова; усеагульная педагогіка; тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізічнай культуры;

*без адрыву ад вытворчасці:*

фізіка ядра і элементарных часціц; аналітычная хімія; заалогія; генетыка; эканоміка і ўпраўленне народнай гаспадаркай; руская мова.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме дзейнічаючай праграмы для ВНУ.

Прыём дакументаў і субяседаванні з загадчыкамі кафедр або мяркуемымі навуковымі кіраўнікамі да 10 верасня 1997 года.

Заява аб прыёме ў аспірантуру падаецца на імя рэктара з дадаткам: асабістага ліста па ўліку кадраў з 3-мя фатакарткамі; аўтабіяграфія; характарыстыка-рэкамендацыя з апошняга месца працы; копіі дыплома аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і копіі выпіскі з заліковай ведамасці; спіс навуковых прац, вынаходніцтваў і справаздач аб навукова-даследчай рабоце, а пры іх адсутнасці -- рэферата па выбранай навуковай спецыяльнасці; выпіскі з пратакола пасяджэння вучонага савета для асоб, рэкамендаваных у аспірантуру вучонымі саветамі ВНУ (факультэтаў) непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы; пасведчання па форме 2.2 аб здачы кандыдацкіх экзаменаў для асоб, поўнасцю або часткова здаўшых кандыдацкія экзамены; меддаведкі (форма N 086-У); выпіскі з працоўнай кніжкі.

Уступныя экзамены праводзяцца з 1 па 30 кастрычніка 1997 года. Дакументы накіроўваць да 10 верасня 1997 года на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104, аддзел аспірантуры. Тэлефон 56-21-29.

# АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА ПАДПІСКА НА УНІВЕРСІТЭЦКУЮ ГАЗЕТУ

28-ы год выдаецца ў нашай ВНУ шматтыражная газета "Гомельскі універсітэт". І ўвесь гэты час яна вядзе своеасаблівы летапіс шматграннага жыцця і дзейнасці Гомельскага дзяржаўнага універсітэта -- вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установы Беларускага Палесся.

Але, на жаль, тое няпростае эканамічнае становішча, у якім апынуліся ўсе рэспублікі былога СССР, у тым ліку і наша Беларусь, адмоўным чынам уплывае і на стан, фінансавае забеспячэнне вышэйшай школы, на ўсе яе састаўляючыя. Наша газета -- не выключэнне. Растуць, нібы снежны камяк, грашовыя затраты на яе выданне. Для іх частковага пакрыцця, а калі сказаць больш дакладна, сімвалічнага, патрэбна матэрыяльная падтрымка выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў ГДУ. З гэтай мэтай аб'яўляецца падпіска на універсітэцкую газету на бягучы навучальны год. Яе кошт 15 тыс. руб.

Сабраныя грошы ад факультэтаў, кафедр і іншых падраздзяленняў неабходна здаваць у касу універсітэта па прыходных ордэрах бухгалтэрыі, а квіткі -- прыносіць у рэдакцыю (галоўны корпус, п. 1-18) для ўліку колькасці падпісчыкаў.

Падпіску на універсітэцкую газету неабходна правесці да 1-га лістапада.

**Рэдакцыя газеты "Гомельскі універсітэт".**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- беларускай літаратуры -- асістэнта;
-- псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі -- асістэнта (2), заг. кафедры, дацэнта;
-- геаэкалогіі -- асістэнта (2);
-- рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства -- дацэнта;
-- беларускай мовы -- асістэнта;
-- тэорыі і практыкі англійскай мовы -- выкладчыка (2);
-- алгебры і геаметрыі -- заг.кафедры;
-- вышэйшай матэматыкі -- ст. выкладчыка (2);
-- матэматычнага аналізу -- ст.выкладчыка;
-- аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры -- ст. выкладчыка (2);
-- бухгалтарскага ўліку, кантролю і АГД -- ст.выкладчыка (2);
-- дыферэнцыяльных ураўненняў -- ст.выкладчыка;
-- матэматычных праблем кіравання -- ст.выкладчыка;
-- эканамічнай інфарматыкі і АСК -- асістэнта (2);
-- тэарэтычнай фізікі -- дацэнта (2);
-- агульнай фізікі -- асістэнта;
-- АСАІ -- асістэнта;
-- фізвыхавання і спорту -- заг.кафедры.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней І месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліграфдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 320
Падпісана да друку 27.08.97.